ВЯСНА ЭКЗАРХА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Працаваць побач з Экзархам — тое, што і жыць поўным жыццём»

Прэс-сакратар Патрыяршага Экзарха Андрэй ПЕТРАШКЕВІЧ працуе побач з уладыкам Філарэтам больш за 20 гадоў. Гэта яму належаць ідэі дзвюх кніг, прысвечаных юбілею мітрапаліта. Пра адну з іх — **«Думкі сэрца»**, якая выходзіць у Выдавецтве Свята-Елізавецінскага манастыра, Андрэй Аляксандравіч кажа з асаблівым хваляваннем:

— Гэта літаратурны альбом. Маладыя людзі, якія дапамагалі альбом складаць, — супрацоўнікі рэдакцыі Мінскіх епархіяльных ведамасцяў і выдавецтва Свята-Елізавецінскага манастыра, усё зразумелі адразу, толькі сумняваліся, ці можна так вольна і смела? А я ім казаў: трэба. Прычым важна ўсё зрабіць менавіта з драйвам. Рэч у тым, што мы падзялілі тэксты ўладыкі, і кожны выбраў тое, на што адгукалася яго сэрца. Потым мы сабралі самыя цёплыя, на наш погляд, фатаграфіі Экзарха, і да кожнай падбіралі цытату па асацыяцыі. І калі той, хто возьме альбом у рукі, не проста ўбачыць Экзарха ў розных абставінах, звыклых і нязвыклых, не толькі ўбачыць пастара, манаха, малітоўніка, старца, але і пачуе ягоныя словы, зусім не выпадковыя, пачуе сэрцам, — значыць, мы дасягнулі мэты.

Журналістка газеты «Звязда» стала першым чытачом гэтага незвычайнага альбома. Кніга сапраўды атрымалася цёплай і хвалюючай. Яе хочацца гартаць, з новых бакоў адкрываць для сябе чалавека, які кіруе Беларускай Праваслаўнай Царквой. Вось ён на могілках суцяшае нейкую жанчыну, і нейкім дзіўным жэстам трымае яе за галаву. Такі рух можа быць прадыктаваны толькі сэрцам, калі слоў — недастаткова... Вось моліцца ў адзіноцтве, разбірае паперы на працоўным стале, благаслаўляе зняволеных, размаўляе з дзецьмі... Якім жа прасветленым і нават дзіцячым становіцца яго твар пры гэтым!..

Побач з такімі здымкамі асаблівым чынам успрымаюцца ягоныя словы. Быццам ён кажа толькі табе, у даверлівых і адасобленых абставінах:

«Пераадолець грэх — значыць разарваць замкнёнае кола сваёй самасці, быць гатовым для самаадданых зносінаў з іншымі, бо тое багацце быцця, якое падараваў Бог, можа быць зведана і перажыта толькі разам»...

— Працаваць побач з Экзархам — як? — пытаюся ў Петрашкевіча. — Цяжка ці лёгка?

Падумаўшы, ён адказвае:

— Гэта як жыць поўным жыццём, тут ёсць усё: радасць і смутак, перагрузкі і натхненне, іспыты і суцяшэнні. Працаваць побач з уладыкам — тое, што і жыць.

З біяграфіі

Мітрапаліт Філарэт (у міры Кірыл Варфаламеевіч Вахрамееў) нарадзіўся 21 сакавіка 1935 года ў Маскве, у сям'і музычных педагогаў. Дзед уладыкі — вядомы яраслаўскі купец, а з 1913 года радавы дваранін. Бацька, Варфаламей Аляксандравіч, выкладчык Гнесінскага музычнага вучылішча пры Маскоўскай кансерваторыі, аўтар падручнікаў па тэорыі музыкі і царкоўных спевах.

Пасля заканчэння школы Кірыл Вахрамееў паступіў у Маскоўскую Духоўную семінарыю. У адным з інтэрв'ю «Звяздзе» мітрапаліт узгадваў, што выбар за яго зрабіла хросная маці. Разам з сябрам ён збіраўся паступаць у інстытут замежных моў, але сур'ёзна захварэў. Тады хросная маці прыйшла, паклала перад юнаком Псалтыр і сказала цвёрда: «Усё, ніякіх інстытутаў. Вучыся чытаць па-славянску. Рыхтуйся паступаць у семінарыю».

Пасля Семінарыі была Духоўная Акадэмія, на другім курсе якой ён прыняў пострыг з імем у гонар святога Філарэта Міласцівага. Праз тры тыдні, 26 красавіка 1959 года, Свяцейшы Патрыярх Аляксій рукапалажыў манаха Філарэта ў іерадыякана. Пасля заканчэння Акадэміі іерадыякан, потым іераманах Філарэт, кандыдат багаслоўя, застаўся там выкладаць. На пачатку 60-х ён стаў адным з самых маладых педагогаў Духоўных школ.

У кастрычніку 1965 года адбылася епіскапская хіратонія (прысвячэнне) іераманаха Філарэта (Вахрамеева). Вясной наступнага года 31-гадовы епіскап атрымаў пасаду рэктара Маскоўскай Духоўнай Акадэміі. У 1968 годзе Патрыярх і Сінод прызначылі епіскапа Філарэта другім намеснікам старшыні Аддзела знешніх царкоўных зносінаў. Праз тры гады ён узведзены ў сан архіепіскапа.

У красавіку 1973 года Праасвяшчэнны Філарэт прызначаны Патрыяршым Экзархам Сярэдняй Еўропы, узначальвае Берлінскую і Сярэднееўрапейскую кафедру. Праз два гады Патрыярх Пімен надаў яму сан мітрапаліта.

10 кастрычніка 1978 года ўладыка Філарэт прызначаны Мітрапалітам Мінскім і Беларускім, Патрыяршым Экзархам Заходняй Еўропы.

З 1981 па 1988 год ён з'яўляўся адным з кіраўнікоў Камісіі па падрыхтоўцы і правядзенні ўрачыстасцяў, прысвечаных 1000-годдзю Хрышчэння Русі. У гэты час мітрапаліт Філарэт займае пасаду старшыні Аддзела знешніх царкоўных зносінаў Маскоўскага Патрыярхату, ён пастаянны член Свяшчэннага Сінода Рускай Праваслаўнай Царквы.

16 кастрычніка 1989 года ў сувязі з утварэннем Беларускага Экзархата Маскоўскага Патрыярхату Мітрапаліт Мінскі і Гродзенскі Філарэт прызначаны Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі.

У сакавіку 1990 года адбылося абранне мітрапаліта народным дэпутатам Рэспублікі Беларусь. У 1991 годзе, са студзеня па снежань, уладыка — народны дэпутат СССР.

У снежні 1993 года прызначаны старшынёй Сінадальнай Багаслоўскай Камісіі.

З 18 лютага 1992 года ўладыка Філарэт носіць тытул «Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра свяшчэнанаархімандрыт».

> **Часам здавалася, што ўсё, застаецца толькі апошняя мера — пазбаўленне сану, і раптам уладыка выказваецца насуперак агульнаму меркаванню, падобна міласціваму бацьку, і гэта дзейнічае на ўсіх як халодны душ.**

Напярэдадні — амаль два дзесяцігоддзі карпатлівай і вялікай работы па адраджэнні і станаўленні праваслаўя на беларускіх землях...

«Яго мастацтва кіраўніцтва падобнае на клопат садоўніка»

Аповед пра род Вахрамеевых змяшчае другое падарункавае выданне **«Жыццё на шляху праўды (Мітрапаліт Філарэт з роду Вахрамеевых)»**, якое днямі выйшла ў Выдавецтве Беларускага Экзархата. Кніга складаецца з трох няроўных частак. Першая, самая вялікая, — гісторыя сям'і, якую апісаў бацька ўладыкі, другая — успаміны пра дзяцінства, сям'ю і жыццёвы шлях самога мітрапаліта. Трэцяя — яго выказванні з нагоды ўсіх значных падзей у Царкве, удзельнікам якіх ён быў.

— Можна лічыць сапраўдным цудам тое, што рукапіс Варфаламея Аляксандравіча «Гісторыя роду Вахрамеевых і Сямейная хроніка» ўпершыню ўбачыла свет у складзе кнігі «Жыццё на шляху праўды» менавіта 18 сакавіка — у Дзень нараджэння Варфаламея Аляксандравіча! — падзяліўся радасцю складальнік кнігі Андрэй Петрашкевіч. — Бо пра гэта ніхто знарок не думаў.

— Кніга раскрывае карані неардынарнай асобы нашага Экзарха, — расказвае **выканаўчы дырэктар выдавецтва Уладзімір ГРОЗАЎ**. — Мітрапаліт Філарэт паходзіць з вядомага роду, у якім людзі служылі Айчыне ў самых розных галінах: яны былі дзяржаўнымі і грамадскімі дзеячамі, дзеячамі мастацтва. Але ўсіх іх аб'ядноўвала адно — гэта былі людзі высокай духоўнасці, культуры і шчырыя патрыёты сваёй зямлі. Вось гэтая закваска і перайшла да ўладыкі, яе ён памнажае, умацоўвае і ад гэтай жа закваскі сілкуюцца ўсе, хто побач з ім, і на гэтым хлебе ўскормленыя ўжо амаль два пакаленні праваслаўнага народу ў Беларусі. Ніхто не стане спрачацца, што па аўтарытэце, значнасці сваёй дзейнасці ўладыка Філарэт — асоба выбітная. Бо «па іхніх пладах пазнаеце іх» (*Мат. VII, 16.*). Плады Праваслаўнай Царквы сёння відавочныя — гэта паўтары тысячы прыходаў, дзясяткі манастыроў, цалкам адроджаная епархіяльная структура — 11 епархій. Калі мітрапаліт прыйшоў, была адна...

Мастацтва кіраўніцтва ўладыкі Філарэта непаўторнае, заўважае дырэктар выдавецтва, ён падобны на садоўніка, які не перашкаджае і не навязвае дрэву, як яму расці і пладаносіць. «Ён зграбна і пяшчотна падпраўляе, падрэзае тыя непатрэбныя моманты, якія ўзнікаюць у дзейнасці нашай арганізацыі і нашых творчых працэсаў. Усё гэта атрымоўваецца натуральна і гарманічна».

Спецыяльна да юбілею Выдавецтвам Беларускага Экзархата была падрыхтавана яшчэ адна кніга — **«Дарогамі праваслаўнай Беларусі»**, якая адлюстроўвае якраз плады 30-гадовага служэння мітрапаліта Філарэта на нашай зямлі. Гэта аўтарскі погляд на Царкву і яе святыні. Група журналістаў і фатографаў аб'ехала Беларусь, пабывала ў многіх мясцінах і, выкарыстоўваючы інфармацыю аб гістарычных падзеях, якія з гэтымі святынямі звязаныя, склала свой аповед аб сённяшняй праваслаўнай Беларусі.

— Кніг, дзе было б так шмат і так цёпла, з жывым удзелам напісана пра нашы святыя мясціны, мы яшчэ не выпускалі, — каментуе Уладзімір Грозаў. — У гэтым яе каштоўнасць. Думаю, выданне будзе карысным для кожнай сям'і і для кожнага настаўніка, бо без аповеду пра Бацькаўшчыну, пра яе духоўныя цэнтры і сімвалы немагчыма зарыентаваць чалавека ў бурлівым моры жыцця.

«Яго мудрасць у дабрыні і чалавечнасці»

— Значэнне асобы мітрапаліта Філарэта для беларускага духавенства немагчыма пераацаніць, — расказвае **настаяцель Сабора ў гонар іконы «Усіх тужлівых Радасць» протаіерэй Ігар КАРАСЦЯЛЁЎ**. — Дзякуючы яго мудрасці, чалавечнасці і дабрыні, Беларуская Праваслаўная Царква ў часы вялікіх іспытаў і спакусаў захавала сваё адзінства. Дзіўным пры гэтым з'яўляецца тое, што ўладыка вельмі доўга дарує чалавеку, які адхіліўся. Дапамагае, дае магчымасць выправіцца. Калі гэтага ўсё ж не адбываецца, мітрапаліт не прымае кардынальных мераў, ён збірае епархіяльны савет альбо старэйшых святароў і... дае магчымасць чалавеку выслухаць духоўных братоў, асэнсаваць, што ён памыліўся. Ён доўгацярплівы. Яго нябесны апякун — святы Філарэт Міласцівы, і мітрапаліт цалкам апраўдвае дадзенае яму імя ў гонар святога. Я сам быў на такіх саветах, і часам здавалася, што ўсё, застаецца толькі апошняя мера — пазбаўленне сану, і раптам уладыка выказваецца насуперак агульнаму меркаванню, падобна міласціваму бацьку, і гэта дзейнічае на ўсіх як халодны душ. Тады думаеш: сапраўды, трэба дапамагчы, а не караць.

У маім жыцці Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт мае асаблівае значэнне. Не толькі таму, што ён прымаў рашэнне аб маім святарскім прысвячэнні, не толькі таму, што ён прызначыў мяне настаяцелем прыхода іконы «Усіх тужлівых Радасць». Ён замяніў мне бацьку. Мой тата цяжка хварэў і рана сышоў, і ў сталым узросце мне не было адкуль атрымаць парады і дапамогі ў любых жыццёвых сітуацыях, не было з кім падзяліцца радасцю. Пакуль я не пазнаёміўся з уладыкам Філарэтам. Гэта адбылося яшчэ ў 70-я гады, калі я быў прыхаджанінам Свята-Духава кафедральнага сабора.

Я малюся за яго як за свайго духоўніка. Як раней маліўся за архімандрыта Іаана (Красцьянкіна), старца Пскова-Пячорскага манастыра, які таксама шмат для мяне зрабіў. У самых цяжкіх сітуацыях, калі сэрца разрываецца ад невырашальнасці праблемы альбо ахопліваe сум ад безвыходнасці сітуацыі, я бягу да ўладыкі Філарэта і прыношу яму сваю скруху, і ён дапамагае вырашыць любую сітуацыю. А калі нейкая радасць, то дзялюся ёю.

Мітрапаліт вельмі ўважлівы да ўсіх людзей. Ён можа бясконца выслухоўваць чалавека, і бясконца дапамагаць тым, хто да яго звяртаецца. Асабістыя праблемы любога святара для мітрапаліта заўсёды на першым плане. Гэта чалавечая рыса вельмі важная для кіраўніка такой складанай арганізацыі, як Беларуская Праваслаўная Царква...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Архіпастыр і Беларусь

Праца Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта на Беларускай кафедры, на якую ён быў прызначаны ў 1978 годзе

Яшчэ ў савецкі час ён дабіўся ўтварэння БЕЛАРУСКАГА Экзархата з другой кананічнай назвай «Беларуская Праваслаўная Царква» і надання яму адпаведнага статусу САМАСТОЙНАСЦІ. Сёння мы маем Святы Сінод БЕЛАРУСКАЙ Праваслаўнай Царквы.

У Беларусі адноўлены 10 гістарычных епархій.

Па яго ініцыятыве ў 1984 годзе Свяшчэнным Сінодам Рускай Праваслаўнай Царквы было прынятае рашэнне аб усталяванні Сабора БЕЛАРУСКІХ святых і ўсталявана агульнацаркоўнае іх шанаванне.

Яму ўдалося пабудаваць новы будынак Епархіяльнага ўпраўлення. (Стары знаходзіўся ў невялікім доме на вул. Чарвякова.) Дамавая царква Мінскага епархіяльнага ўпраўлення па благаславенні мітрапаліта Філарэта была асвечаная ў імя Сабора БЕЛАРУСКІХ святых.

Па ініцыятыве мітрапаліта ў 1989 годзе была створана Біблейская камісія, якая пачала пераклад кніг Свяшчэннага Пісання на сучасную беларускую мову. Некалькі кніг ужо выдадзена. З выдадзеных на беларускай мове буйных альбомаў: «Начаткі праваслаўя», «Падзвіжнікі і іх святыні», «Святое Пісанне для дзяцей», «Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны» з артыкуламі на беларускай і рускай мовах. Шмат гадоў выдаецца царкоўны каляндар на беларускай мове.

З першых кніг, якія выпусціў Экзархат, былі: «Праваслаўныя святы», «Праваслаўнае дойлідства Беларусі», у апошняй прадстаўленыя ўсе выдатныя помнікі-храмы Беларусі. Пазней у гэтай серыі выйшлі кнігі: «Прападобная Ефрасіння Полацкая», «Крыж — краса Царквы» пра ініцыяванае мітрапалітам аднаўленне найвялікшай святыні Праваслаўнай Беларусі — Крыжа прападобнай Ефрасінні Полацкай. Апошняй выйшла кніга «Праваслаўныя манастыры Беларусі», у якой сабраныя сведчанні пра ўсе манастыры, якія існавалі ў Беларусі раней, і якія існуюць сёння.

Мітрапаліт стаў ініцыятарам збору сведчанняў пра свяшчэннаслужыцеляў і міранаў, якія перажылі рэпрэсіі ў гады багаборніцкай улады. І сёння мы маем агульнацаркоўнае памінанне Святых Новапакутнікаў БЕЛАРУСКІХ.

Па яго ініцыятыве працягваецца праца па прылічэнні да ліку святых падзвіжнікаў у Беларусі. З апошніх — прападобны Іаан Кармянскі, блажэнная Валянціна Мінская.

Можна шмат казаць пра яго ўклад у аднаўленне манаскага жыцця ў Беларусі, аб адраджэнні духоўнай адукацыі. Тут і Акадэмія, і Семінарыя, і Духоўныя вучылішчы, і школы, і г.д. У Беларусі шмат гадоў працуе Тэалагічны інстытут. Ні ў Расіі, ні ў іншых краінах СНД такіх навучальных устаноў няма. Ён стаў пачынальнікам царкоўна-гістарычных даследаванняў у Беларусі. Сёння ўсе матэрыялы па Беларусі для шматтомнага выдання Праваслаўнай Энцыклапедыі паступаюць толькі ад беларускіх гісторыкаў...

Працытавана з форуму «Мураўёўкі» і праваслаўная сучасная архітэктура» на сайце www.sobor.by.

Запрашальнік

НА ВЕРБНЫ КІРМАШ ПА... БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

Сёння ў мінскім Палацы мастацтва адкрываецца традыцыйная перадвелікодная праваслаўная выстава-кірмаш

Цырымонія адкрыцця, у якой возьме ўдзел Епіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі Арцемій, адбудзецца а 14 гадзіне. Амаль адразу пасля гэтага запланавана прэзентацыя кнігі епіскапа Арцемія «Увядзенне ў праваслаўнае багаслоўе», у якой будуць удзельнічаць таксама епіскап Бабруйскі і Быхаўскі Серафім, кіраўніцтва Хрысціянскага адукацыйнага цэнтра і выкладчыкі Інстытута тэалогіі БДУ.

У выставе бяруць удзел 80 экспанентаў: манастыры, прыходы, выдавецтвы з Беларусі, Украіны, Расіі, Ізраіля, Турцыі, Грэцыі. Як заўсёды, тут можна набыць падарункі, сувеніры, кнігі, фільмы, мёд, зёлкі, абразы і шмат іншага.

Кірмаш будзе доўжыцца сем дзён, на працягу якіх адбудзецца і багатая духоўна-асветніцкая праграма. 22 сакавіка прысвечана дзіцячаму чытанню, на наступны дзень на творчую сустрэчу запрашае народная актрыса Беларусі Марыя Захарэвіч, у сераду — прэзентацыя кнігі і фільма, прымеркаваных да 75-годдзя Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта. У гэты ж дзень праект, які распавядзе пра мерную ікону — старажытны царкоўны звычай пісаць ікону да дня хрышчэння немаўляткі памерам у яго рост і з выявай святога, у гонар якога названа дзіця. У чацвер пройдзе «круглы стол» з удзелам праваслаўных урачоў...

А вось у пятніцу і суботу на кірмашы адбудуцца дзве творчыя вечарыны на беларускай мове. Адну з іх арганізуе сталічны прыход імя Архістратыга Міхаіла (Сухарава), другую — прыход імя Мікалая Японскага (м-н Каменная горка, Мінск).

— Сёння ў царкве назіраецца рост цікаўнасці да беларускай мовы, — падзяліўся з журналістам «Звязды» **клірык Свята-Міхайлаўскага храма іерэй Аляксандр ШРАМКО**. — У нашым прыходзе склалася кола людзей, якія ставяцца да роднай мовы неабыякава, размаўляюць на ёй, моляцца, жадаюць чуць пропаведзі, духоўныя гутаркі. Мы час ад часу збіраемся і ладзім вечарыны, на якіх расказваем пра праваслаўныя цэрквы розных краін: Японіі, Фінляндыі, Ірландыі... Пропаведзі я і раней казаў на беларускай мове, але апошнім часам яны ўспрымаюцца вернікамі з асаблівым натхненнем. Людзі падыходзяць і вельмі горача дзякуюць, радуюцца, што іх дзеці таксама пачулі і ўсё зразумелі.

Абедзве вечарыны будуць прысвечаныя беларускай хрысціянскай песні. Праграму кірмаша можна знайсці на сайце http://www.pravoslav-expo.by, а таксама даведацца па тэлефонах (+375 17) 2737298, 2998299. Выстаўка працуе па адрасе: г. Мінск, вул. Казлова, 3, з 10 да 20 гадзін (у апошні дзень, 27-га — да 19.00).

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

КОЖНЫ ДЗЕНЬ З БАГУШЭВІЧАМ

Гэта не перабольшанне! Я і напраўду кожны дзень — з раніцы да позняга вечара — думаю пра Ф.В., ягоную творчую спадчыну, ягонае самаахвярнае жыццё ва ўсіх яго праявах. Я ўжо і каб хацеў жыць інакш, — не магу. За гады маёй зацікаўленасці постаццю Ф.В., у мяне намножылася гэтулькі рознага матэрыялу, якога мне хопіць на ўсё маё астатняе жыццё. Гэта зусім не якіясь новыя архіўныя знаходкі. Гэта пераважна розныя жыццёвыя імпульсы з ужо нібыта вядомага, але ў маёй акцэнтацыі, у маім адчуванні Ф.В., у маім яго разуменні. Некаторыя з гэтых сваіх акцэнтаў-разваг я і прапаную чытачам «Звязды» з нагоды 170-й гадавіны нашага Прарока і Празорцы Францішка Багушэвіча.

Верш яго просты і суровы.
Максім Багдановіч

Фр. Багушэвіча, адчуў у ім беларускага Празорцу і ў нечым яму, маладому, калі не ва ўсім, то шмат у чым сугучным.

Хто можа сёння з маладых сказаць пра Ф.В гэтак ёмка, як сказаў Максім. «Верш яго просты і суровы». Шмат якія Максімавы вершы з ягоным маладым імпэтам, у яго манеры і стылістыцы. Напісаны ва ўнісон Багушэвічавых думак і разваг пра Беларусь і беларускі народ. Ну хоць бы гэты: Народ! Беларускі народ!

Народ, Беларускі народ!
Ты — цёмны, сляпы, быццам крот.
Табою ўсягды пагарджалі,
Цябе не пушчалі з ярма
І душу тваю абакралі, —
У ёй нават мовы няма.
Збудзіўшысь ад грознай бяды,
Ўвесь поўны смяротнай жуды,
Ты крыкнуць не вольны «Ратуйце!»
І мусіш ты «Дзякуй» крычаць.
Пачуйце ж гэта, пачуйце,
Хто ўмее з вас сэрцам чуваць!

1913

Максім Багдановіч пра Францішка Багушэвіча

«Мы ўсе выйшлі з Багушэвіча», — сказаў неяк літаратурны аналітык Адам Мальдзіс. І сказаў небеспадстаўна. Увесь прыток у нашу літаратуру на пачатку XX стагоддзя сведчыць пра тое. Пад гэтымі словамі Адама Мальдзіса маглі паставіць свае подпісы і Янка Купала, і Якуб Колас, і шмат хто іншы. І нават Максім Багдановіч, такі, здавалася б, эстэт, выкшталцоны паэт-эстэт. У адной сваёй згадцы пра Ф.В., ён кажа: «Багушэвіч амаль што першы прапаведнік усебаковага нацыянальнага адраджэння беларусаў, які даказаў, што яны ўяўляюць асобны самастойны народ...»

І гэта не даніна модзе. Гэта глыбокае Максімава перакананне. Ён у сваіх літаратурна-крытычных нататках не раз згадвае Ф.В. Падамо гэтыя згадкі ў храналагічным парадку.

...1910—1911. У аглядным артыкуле «Неслухоўскі» Францішка Багушэвіча згадвае яшчэ як Мацея Бурачка. У тым жа 1911 годзе, таксама ў аглядным артыкуле, прысвечаным наследнікам Ф.В., Максім Багдановіч называе аўтара «Дудкі беларускай» ужо сваім імем — Багушэвіч, хоць праз колькі гадкоў ён не расстаецца і з Мацеем Бурачком. Кажучы пра Янку Купалу, Максім Багдановіч напісаў: «Пачаў ён з шурпатых вершаў, амаль не зусім зліваўшыхся з тагачасным слоем беларускай паэзіі, напісаных пад Бурачка».

Згадвае Максім Багдановіч Францішка Багушэвіча і ў 1914 годзе ў артыкуле «Белорусское возрождение», як аўтара «Дудкі беларускай» Мацея Бурачка і «Смыка беларускага» Сымона Рэўкі. У гэтым жа артыкуле Максім Багдановіч дае кароткія аўтабіяграфічныя звесткі пра Ф.В. і сціслa характарызуе асаблівасці творчай манеры: «Верш яго просты і суровы, зрэдку гэтая суровасць змяняецца гумарам. У прадмовах да сваіх кніжак Багушэвіч амаль што ці не першы прапаведнік усебаковага нацыянальнага адраджэння беларусаў, сцвярджаючы, што яны — асобны самастойны народ». Гэты свой каментар Максім Багдановіч выказаў усё ў тым жа артыкуле «Белорусское возрождение», напісаным ім у ліпені 1914 года, незадоўга перад пачаткам Першай сусветнай вайны. Максіму Багдановічу на гэты час было ўсяго дваццаць тры гады. А як ён пранікнёна і глыбока прачытаў

З Багушэвічам у вайну

У 2008 годзе ў Беларусі ладзілася Усебеларуская дыктоўка па тэкстах Францішка Багушэвіча, прынамсі паводле Прадмовы да «Дудкі беларускай». Адна з іх была зладжана ў Таварыстве беларускай мовы. Дык вось, пасля згаданай дыктоўкі да мяне падышоў якісь адухоўлены навукай чалавек і даверліва пранікнёна сказаў:

— Магутная гэта Багушэвічава Прадмова. Проста як якісь Маніфест ці Дэкларацыя. Эмацыйная. І пераканаўчая. І з усіх бакоў абгрунтаваная. Супраць яе ні адзін наш незадачлівец не папрэ!..

Трошкі перавёўшы дых, ён працягваў:

— А ведаеце, я сабе Багушэвіча адкрыў. У вайну, дзесь у сорак другім ці сорак трэцім годзе... Жылі мы ў Ямантах. Гэта на Лідчыне. Мой дзядуля Пётра Зайка быў настаўнікам. У яго была досыць ладная бібліятэка. Я з 1934 года. То неяк ўзбіўся на Багушэвічаў зборнічак, пачаў чытаць... Кругом вайна... Немцы... А тут...

Эх, скручу я дудку!
Такое зайграю,
Што ўсім будзе чутка,
Ад краю да краю!
Ой! То будзе гранне,
Як на павітанне
І як на васэле,
Нядоўга тыкеле...

Ці то гэта была прага мірнай ідыліі, ці то сама шчырасць лілася з твора, але верш зразачку запомніўся. Я яго і зараз памятаю, хоць мне ўжо семдзясят пяць. Уразіў мяне і верш «Хрэсьбіны Мацюка», я яго таксама ведаю на памяць. І дацэнт бялагічных навук Зайка цытуе.

Як я толькі нарадзіўся
Бацька сказаў: «Кепска будзе»!
Ну дык жа ж не памыліўся:
Здзекваліся Бог і людзі.
А чым кепска? — бо на марцы
Я радзіўся (пост праўдзівы,
Цяжкі месяц гаспадарцы.
Як пражыў хто, — будзе жывы).

Тую кніжачку чыталі і сям'ёй, знаходзілі ў ёй сабе сугучча. Давалі і суседзям...

Цікаўлюся, тая Багушэвічава кніжачка, якую чыталі ў сям'і Зайкоў у вайну, была надрукавана лацінкаю ці кірыліцай?

Усё пачалося са «Здарэння»

(Як Станіслаў Суднік прыйшоў да роднага слова.)

Усе, хто цікавіцца Таварыствам беларускай мовы, чытаюць «Наша Слова», ведаюць: сёння Станіслаў Суднік — галоўны рэдактар згаданага выдання. А перад гэтым быў вайскоўцам. Але гістарычныя абставіны паклікалі яго на адраджэнскі фронт. У 1997 годзе чыноўнікі незалежнай Беларусі адракліся ад Таварыства беларускай мовы і яго органа «Наша Слова»: адмовіліся яго фінансаваць, ім апекавацца. І вось тады перад Таварыствам паўстала дылема: што рабіць? За што і хто будзе выдаваць газету?

І якраз тады нечакана ў актавай зале колішняга Дома літаратара падняўся шчуплы, але досыць жвавы чалавечак і ўпэўнена сказаў:

— Калі вы не супраць і калі мне даверыце, я бяруся выдаваць «Наша Слова».

Гэтыя Суднікавы словы для разгубленай беларускай грамады прагучалі як збаўленне, як голас з неба. З тае пары я зацікавіўся постаццю Станіслава Судніка, яго асобаю. Спакваля нашы душы зблізіліся, і аднаго разу ў нас з ім неяк зайшла размова пра Ф.В:

— А мой першы вершык, які я вывучыў на памяць, быў Багушэвічаў.

Гэта ўжо цікава.

— І які ж гэта быў вершык?

— «Здарэньне». Пачатак яго такі:

Ехаў я раз ад Кіяны
Ды ў Смургоні, і не п'яны,
І даехаў на Ваўкелы,
А конь добры быў — мой белы.
Тын! Стаў конь наравіцца!
І храпець, і дыба стаў,
Што не можна прыступіцца,
Чуць аглоблі не зламаў.

Далей у тым вершы распавядалася пра бочку з рагамі пры дарозе. Я яшчэ малы быў і не ўсё разумеў. Але бочка тая мяне вельмі ўразіла.

— І ад каго ж ты яго навучыўся? І дзе?

— Ды даўно. Яшчэ ў школу не хадзіў. Ад свае бабулі. Ад Марыі Адамаўны Мысліцкай. У сваіх Сейлавічах. Бабуля была з 1893 года. Была яна непісьменная. А от ад кагосьці навучылася гэтаму вершу.

— І ці не распавядала бабулька хоць калі, ад каго яна навучылася гэтаму вершу?

— А не папытаўся! Не здагадаўся папытацца. Малы быў. А калі захацеў папытацца, не было ўжо ў каго. Бабулька мая памерла ў 1976 годзе.

— І чым жа табе гэты верш лёг на душу? Чым ён цябе зачапіў?

— Іншых вершаў я тады яшчэ не чуў, не ведаў. А тут мая бабулька распавядае мне з памяці такі доўгі верш, поўны розных дзівосаў і прыгодаў, і ён мяне малога сваімі прыгодамі і дзівосамі ўразіў і запомніўся, як казка. Я яго і да гэтай пары памятаю.

Ехаў я раз ад Кіяны...

З бабульчынай памяці ён перадаўся ў маю памяць. Толькі значна пазней я напаткаў гэты верш у Багушэвічавым зборніку твораў. Бабулька ж мая, думаю, не ведала, хто яго аўтар. Верш гэты, пэўна, жыў у той час як народны. З вуснаў у вусны. З памяці ў памяць.

Уладзімір СОДАЛЬ.

ПРАВІНЦЫЯ СА СТАЛІЧНЫМ РАЗМАХАМ

Пра сакрэты будучага «базару», пра паборы з бацькоў, пра тое, што будзе зроблена для ветэранаў перад святкаваннем Перамогі і яшчэ пра многае іншае расказаў старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КОСІНЕЦ прадстаўнікам рэгіянальных СМІ падчас прэс-канферэнцыі

МНОГІЯ цікавыя ідэі, якія ўжо рэалізуюцца, здзіўляюць зусім не правінцыйным размахам. Губернатар быў, як заўсёды, шчырым, не хаваў праблемных нюансаў. Сярод запрошаных на сустрэчу з губернатарам журналістаў быў і карэспандэнт «Звязды».

— Пра важныя рысы развіцця эканомікі віцебскага рэгіёну. Капітальных укладанняў з пачатку пяцігодкі засвоена 13 трыльёнаў рублёў, што паслужыла далейшаму дынамічнаму развіццю прамысловасці, аграпрамысловага комплексу. Платныя паслугі і таваразварот адпаведна павялічыліся за мінулыя чатыры гады адпаведна ў 1,5 і 1,7 раза, — паведаміў губернатар. — Экспарт тавараў складаў за гэты час 9 мільярдаў долараў ЗША і павялічыўся ў 1,4 раза. Але неабходна канстатаваць, што застаюцца праблемныя пытанні. У прыватнасці, валавая прадукцыя аграпрамысловага комплексу. Пачынаючы з 2006 года вобласць не выконвала гэты прагнозны паказчык.

Экспарт тавараў і паслуг — менавіта на гэта сканцэнтравана наша ўвага.

Калі ў 2008 годзе экспарт ажыццяўляўся ў 67 краін свету, ужо летась — у 76, сёлета наша прадукцыя будзе прадстаўлена ў 112 краінах.

Трэба прызнаць, што прамысловасць Віцебшчыны мае вельмі нізкую навукаёмістасць. Знос асноўных фондаў перавышае 60 працэнтаў — а гэта крытычны ўзровень для таго, каб выпускаць канкурэнтаздольную і якасную прадукцыю. Мы не выкарыстоўваем выгаднае геаграфічнае становішча: вобласць — вароты з Еўропы ў Расію. Таму трэба задзейнічаць лагістыку, будаваць адпаведныя цэнтры.

Што датычыцца будаўнічага комплексу, то трэба арганізаваць работу ў дзве-тры змены. І зарплата ў будаўнікоў на Віцебшчыне можа быць сёння як мінімум 2 мільёны рублёў.

ХОПІЦЬ СЯДЗЕЦЬ НА НАФТАВАЙ ІГОЛЦЫ!

— Вобласці пастаўлена задача памяншаць сектар паліўнай прамысловасці, якая складае 55 працэнтаў ад усёй галіны. І мы сёння знаходзімся на так званай нафтавай іголцы, — канстатуе губернатар. — Таму нам трэба развіваць машынабудаванне, аўтамабілебудаванне, станкабудаванне, радыёэлектроніку, дрэваапрацоўчую прамысловасць. У прыватнасці, можам выпрабляць легкавыя і грузавыя аўтамабілі.

Але пра які тавараварот можа ісці размова, калі зарплата будзе на ўзроўні 2009 года — у сярэднім яна склала 332 долары ЗША. Давялі да кожнага прадпрыемства прагнозны паказчык.

ЗА 500 ДОЛАРАЎ ТРЭБА ПАСТАРАЦЦА

— Але галоўны прагнозны паказчык адзін — зарплата — 500 долараў, — падкрэсліў губернатар. — Вось і пад яе ўсе прадпрыемствы вядуць свой разлік. Думаць трэба кіраўнікам: як панізіць сабекошт прадукцыі, паменшыць матэрыялаёмістасць, энергаёмістасць. Вытворчасць працы трэба павысіць як мінімум у 1,5—2 разы.

І трэба пра гэта гаварыць людзям. Хочаце мець заробак, пра які мы кажам, трэба вельмі старанна ставіцца да працы.

Да 2008 года вобласць знаходзілася на апошняй пазіцыі. У 2008-м — на пятым месцы. У 2009-м — на чацвёртым. На пачатак гэтага года — на трэцім (пасля Мінска і Мінскай вобласці).

Калі параўнаць сярэдні заробак кіраўніка і радавога рабочага, то атрымліваецца каэфіцыент 1,9. Невялікі. Зразумела, трэба ж кіраўнікоў зацікавіць у добрай дзейнасці, інакш не будзе становчага выніку.

Паводле слоў губернатара, у вобласці пры развіцці эканомікі ва ўмовах фінансава-эканамічнага крызісу за 2009 год самыя мінімальныя складскія запасы. У няпростых умовах яны склалі 33,9 працэнта — 404 мільярды рублёў, што значна ніжэй, чым у іншых рэгіёнах краіны.

На сёння складскія запасы ў вобласці — на 450 мільярдаў рублёў. Шукаюцца новыя рынкі збыту. Сярод складскіх запасаў нямала і так званых тэхналагічных (напрыклад, сыры павінны дачакацца часу прыдатнасці), сезонных тавараў (у прыватнасці, боты шыюць, якія рэалізуюць у іншы час года). Аблвыканкам дапамагае ў рэалізацыі прадукцыі ўсім прадпрыемствам незалежна ад формы іх уласнасці.

ДЭФІЦЫТУ МЕДЫКАЎ ХУТКА НЕ БУДЗЕ

Губернатар адзначыў, што матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў аховы здароўя ў Віцебску ў нездавальняючым стане. У дрэнным стане інфекцыйная бальніца, толькі напалову рэканструявалі абласную, трэба далей мадэрнізаваць дзіцячую. Таму сёлета будзе дадаткова выдзелена больш за 100 мільярдаў рублёў на капітальны рамонт і рэканструкцыю. Гэта такая сума, якая не была патрачана за апошнія 10 гадоў у сукупнасці. Акрамя гэтага, будзе весціся тэхнічнае пераўзбраенне бальніц, паліклінік.

Што датычыцца кадраў: прыкладна 250 маладых спецыялістаў сёлета прыбудуць па размеркаванні.

— Я быў дзевяць гадоў, пачынаючы з 1997 года, рэктарам Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, — адзначае губернатар. — Калі прымаў кіраўніцтва, уручаў студэнцкія білеты ўсяго 175 чалавекам. І гэта ў ВНУ, якая ўваходзіла ў спіс адной з лепшых у часы СССР. Мы аднавілі набор. Сёння толькі на лячэбным факультэце займаюцца 500 чалавек.

Цяпер у краіне дэфіцыт кадраў — больш за 5 тысяч чалавек. І да 2013 года мы забяспечым краіну ўрачамі. Не забываем і пра вырашэнне праблемы кадраў сярэдняга і малодшага медперсаналу. Усё зробім для таго, каб людзі не стаялі ў чэргах у паліклініках, каб стварыць добрыя ўмовы ў лячэбных установах, аснасціць сучасным абсталяваннем аперацыйныя.

КУЛЬТУРНАЯ ПАЎНОЧНАЯ СТАЛІЦА КРАІНЫ

— Для надання Віцебску статуса паўночнай культурнай сталіцы ў першую чаргу неабходна паказаць гісторыка-культурную значнасць горада, — тлумачыць губернатар. — Сёлета, у прыватнасці, будуць усталяваны помнікі заснавальніцы горада княжне Вользе, князю Альгерду, які заснаваў каменны горад, Аляксандру Неўскаму з жонкай і сынам.

Мікрараён, дзе знаходзіцца дом сям'і Шагала, будзе рэканструяваны. Акрамя гэтага, вядзём перамовы з яго унучкай, каб арганізаваць выставу сапраўдных твораў, а не копій Шагала.

КДБ пераедзе ў новы будынак. А губернатарскі палац, дзе пакуль што знаходзіцца ўпраўленне камітэта, стане музеем. Будзем далей рамантаваць Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа. Кінатэатр «Брыганціна» будзе рэканструяваны і атрымае сучаснае абсталяванне, сучасныя тэхналогіі паказу кіно будуць выкарыстаныя пры стварэнні кінатэатра ў гандлёвым цэнтры «Беларусь», які раней быў кінатэатрам. Канцэртная зала «Віцебск» будзе мадэрнізаваная, як і Лядовы палац.

Сёлета міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», паводле слоў губернатара, будзе значна адрозніваецца ад мінулых. Упершыню на галоўнай плошчы Віцебска — Перамогі, пад адкрытым небам перад 100 тысячамі гледачоў пройдуць моладзевыя канцэрты пад рабочай назвай «Дні Еўропы». Іх правядзенне стане магчымым дзякуючы сцэнічнай пляцоўцы і сучаснаму гукавому і светлавому абсталяванню. Гэты канцэртны комплекс будзе, як запэўніў губернатар, не горшы, чым на Краснай плошчы ў Маскве. Упершыню пакажуць у фестывальным горадзе шыкоўнае лазернае шоу.

Каб у правінцыйны горад і да «базару», і падчас яго змаглі прыехаць для выступленняў «зоркі» першай велічыні, асабіста губернатар шукае інвестараў для будаўніцтва гатэля класа 5 зорак.

ХОПІЦЬ БРАЦЬ ГРОШЫ З БАЦЬКОЎ!

— Усё гэта трэба неадкладна спыніць! — прынцыпова адзначыў губернатар, адказваючы на пытанне «Звязды» наконт традыцыйных добраахвотных-прымусовых грашовых збораў з бацькоў у садках і школах. — Хто хоча аказаць спонсарскую дапамогу — калі ласка. Калі маці дзіцяці працуе, напрыклад, прыбіральшчыцай або санітаркай, і пяць тысяч рублёў для яе — вялікія грошы. Прадпрыемствы і арганізацыі трэба замацаваць за ўстановамі адукацыі. Хай дапамагаюць.

КАБ У ВЕТЭРАНАЎ НЕ БЫЛО КРЫЎДАЎ

У Віцебскай вобласці жыве больш за 6,7 тысячы ветэранаў.

— Для мяне самае галоўнае, каб у ветэранаў не было ніякіх крыўдаў на нас, — разважае губернатар. — На тое што мы нешта не зрабілі для іх. Летась мы палепшылі ўмовы жыцця 26 ветэранаў. Толькі 9 засталіся, у якіх ёсць у гэтым неабходнасць. Зробім абавязкова да Дня Перамогі ўсё, што неабходна. Усе ветэраны пройдуць медыцынскае абследаванне. Прывядзём у парадак больш за 2,5 тысячы месцаў вайсковых пахаванняў, манументаў. Сёлета на гэтыя мэты выдзяляецца больш за 1 мільярд 100 мільёнаў рублёў. І надалей будзе весціся работа па ўстанаўленні прозвішчаў пахаваных воінаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Здарэнне

ЗНОЎ ВЫБУХНУЎ КАЦЁЛ, ЗАГІНУЎ ЧАЛАВЕК

Учора «Звязда» паведаміла пра выбух самаробнага ацяпляльнага катла ў Магілёве, а цяпер падобнае здарэнне адбылося ў Бабруйску. Прычым не абышлося без ахвяраў: 75-гадовы гаспадар прыватнага дома на вуліцы Рэпіна загінуў.

Як паведамілі ў Магілёўскім абласным упраўленні МНС, пажар убачыў сусед і выклікаў выратавальнікаў. Яны знайшлі цела пенсіянера літаральна за два метры ад выратавальнага выхаду.

Ачаг узгарання знаходзіўся ў кухні, дзе месціўся ацяпляльны кацёл. Верагодна, што прычынай пажару стала парушэнне правілаў пажарнай бяспекі пры абсталяванні і эксплуатацыі катла. Пажарам знішчаны дах і маёмасць на верандзе.

Ілона ІВАНОВА.

УПРАВЛЯЮЩИЙ РУП «ТОРГОВЫЙ ДОМ БЕЛХЛЕБОПРОДУКТ» ХАДКЕВИЧ А.Д.

ПРОВОДИТ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ СКЛАДСКОЙ БАЗЫ 1975 ГОДА ПОСТРОЙКИ ПЛОЩАДЬЮ 1,2 га в г. ЗАСЛАВЛЬ В СОСТАВЕ:

3 кирпичных складских помещения (площадью 1205,7 кв. м, 985,5 кв. м, 581,6 кв. м), 2 административных здания (площадью 105,1 кв. м, 66,1 кв. м), крановая однопролетная эстакада с бетонным покрытием и двумя кран-балками грузоподъемностью по 5 т каждая (площадь 1440 кв. м). База примыкает к железнодорожной станции «Беларусь», подъездные пути, электрокабельная линия, водоснабжение, телефон.

Торги состоятся **29 марта 2010 года в 11 часов** по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15, ком. 201. Задаток для участников 20,0 млн руб. перечисляется на расчетный счет РУП «Торговый Дом Белхлебопродукт» № 3012200130017 в ОАО «Бел АПБ«МГД» г. Минск, код 963, УНП 100079803.

Заявки принимаются **до 18.00 28 марта 2010 года.**

Начальная цена 800 000 000 бел. руб.

Конт. тел. 8(029) 120 98 56, 8(029) 614 02 69.